УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі
Факультэт упраўлення і прафесійнага развіцця педагогаў
Кафедра менеджмента і адукацыйных тэхналогій

# ФАРМІРАВАННЕ МОЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ВУЧНЯЎ З ЦЯЖКІМІ ПАРУШЭННЯМІ МАЎЛЕННЯ СРОДКАМІ ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАТЫЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Дапушчана да абароны
ў Дзяржаўнай
экзаменацыйнай камісіі

Загадчык кафедры
__________Т.А.Шакун
__19.12.__2023

Дыпломная работа
слухача другога года навучання
групы ІШ-221 спецыяльнасці
перападрыхтоўкі 1-03 03 77
"Інтэграванае навучанне
і выхаванне ў школьнай адукацыі"
завочнай формы атрымання адукацыі
Кабак Алены Леанідаўны

Кіраўнік:
Брыкава Аляксандра Сяргееўна,
кандыдат псіхалагічных навук,
дацэнт

Абаронена __26.12.__2023
з адзнакай __10__(________)

Мінск, 2023

# АГЛАЎЛЕННЕ


УВОДЗІНЫ 3

ГЛАВА 1 ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ МОЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ВУЧНЯЎ З ЦЯЖКІМІ ПАРУШЭННЯМІ МАЎЛЕННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ 6

1.1 Тэарэтычна-метадалагічныя падыходы да фарміравання моўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы 6

1.2 Асаблівасці фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення 13

1.3 Аналіз выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у адукацыйным працэсе спецыяльнай адукацыі 21

ГЛАВА 2 ВОПЫТ ФАРМІРАВАННЯ МОЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ВУЧНЯЎ З ЦЯЖКІМІ ПАРУШЭННЯМІ МАЎЛЕННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ 28

2.1 Арганізацыя і метады даследавання ўзроўню моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення 28

2.2 Аналіз і абагульненне вынікаў педагагічнага эксперыменту 33

ГЛАВА 3 ДЫДАКТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЭЛЕКТРОННАГА АДУКАЦЫЙНАГА ДАПАМОЖНІКА “САМАСТОЙНЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ” Ў ФАРМІРАВАННІ МОЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ВУЧНЯЎ З ЦЯЖКІМІ ПАРУШЭННЯМІ МАЎЛЕННЯ 39

3.1 Працэсуальная характарыстыка электроннага адукацыйнага дапаможніка “Самастойныя часціны мовы” 39

3.2 Метадычныя рэкамендацыі па эфектыўным выкарыстанні электроннага адукацыйнага дапаможніка “Самастойныя часціны мовы” на ўроках беларускай мовы 42

ЗАКЛЮЧЭННЕ 47

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС 50

ДАДАТКІ 54

гадзіну на тыдзень, што гаворыць аб тым, што ў іх недастаткова сфарміравана моўная кампетэнцыя.

Улічваючы сучасныя рэаліі, настаўнік павінен валодаць новымі метадамі навучання, інфармацыйнай культурай і медыякампетэнтнасцю. Педагогу неабходна навучыць сваіх вучняў за кароткі прамежак часу асвойваць, пераасэнсоўваць і выкарыстоўваць масіў інфармацыі, стварыць спрыяльныя ўмовы для фарміравання ў іх моўнай кампетэнцыі. Для гэтага вельмі важна арганізаваць адукацыйны працэс так, каб кожны вучань з захапленнем працаваў на ўроку, бачыў плён сваіх намаганняў, авалодваў ведамі пра сістэму мовы, правілы функцыянавання адзінак мовы ў маўленні, быў здольным з дапамогай гэтай сістэмы разумець чужыя думкі і выяўляць уласныя меркаванні ў вуснай і пісьмовай формах [8, с. 104–113].

Дапамагчы настаўніку, які працуе з вучнямі з цяжкімі парушэннямі маўлення, у вырашэнні гэтых няпростых задач можа спалучэнне традыцыйных метадаў навучання і сучасных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, што дазволіць зрабіць працэс асэнсавання, разумення і засваення ведаў больш мабільным, строга дыферэнцыраваным і індывідуальным [16, с. 41].

У сувязі з гэтым для актывізацыі кампенсаторных механізмаў, дасягнення аптымальнай карэкцыі парушаных функцый развіцця вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення, фарміравання ў іх моўнай кампетэнцыі актыўна выкарыстоўваюцца сэрвісы Web 2.0 (My Word Art, Word cloud, Edrow Mind Master, Wizer.me, Google Формы, LearningApps), дзякуючы якім ёсць магчымасць распрацаваць дыдактычны матэрыял, улічваючы спецыфіку развіцця дзяцей.

Шматлікія сучасныя даследаванні сцвярджаюць, што 80% інфармацыі чалавек успрымае праз убачанае і зробленае, а дзяцей XXI стагоддзя называюць пакаленнем Z, якому ўласціва запамінаць інфармацыю вобразамі-карцінкамі. Актуальнасць выкарыстання магчымасцей інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у навучальным працэсе заключаецца яшчэ і ў тым, што гэта магутныя інструменты данясення вучэбнага матэрыялу да вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, памочнікі ў самастойным успрыманні і аналізе інфармацыі. Праз іх выкарыстанне павышаецца якасць засваення вучэбнага матэрыялу па беларускай мове, што станоўча ўплывае на вучэбную матывацыю і эфектыўнасць навучання, дазваляе індывідуалізаваць навучальны працэс, актывізаваць пазнавальную дзейнасць, развіваць камунікатыўныя навыкі вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення [7].

Існуюць разнастайныя трэнажоры, электронныя сродкі навучання і адукацыйныя рэсурсы па беларускай мове, якія разлічаны выключна

на здольнасці нарматыповых вучняў, якія вельмі складана адаптаваць пад магчымасці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Таму патрэбны сучасныя распрацоўкі менавіта для вучняў з пэўнымі асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца працэс фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення на ўроках беларускай мовы.

Прадметам – выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у працэсе фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення на ўроках беларускай мовы.

Мэта даследавання – тэарэтычна абгрунтаваць і метадычна забяспечыць працэс фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення на ўроках беларускай мовы сродкамі электроннага адукацыйнага дапаможніка “Самастойныя часціны мовы”.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1. Раскрыць тэарэтычна-метадалагічныя падыходы да фарміравання моўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы.
2. Вызначыць асаблівасці фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення.
3. Распрацаваць электронны адукацыйны дапаможнік “Самастойныя часціны мовы” і вызначыць яго дыдактычны патэнцыял у фарміраванні моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення на ўроках беларускай мовы.
4. Укараніць электронны адукацыйны дапаможнік “Самастойныя часціны мовы” ў працэс выкладання вучэбных прадметаў “Беларуская мова і літаратура” і “Беларуская мова”.

Метады даследавання: тэарэтычныя (аналіз навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры па праблеме даследавання, параўнанне, абагульненне), эмпірычныя (педагагічнае назіранне, бяседа, тэсціраванне, педагагічны эксперымент).

База эксперыментальнай работы – 8 “А” і 8 “Б” класы дзяржаўнай установы адукацыі “Вілейская спецыяльная школа-інтэрнат”.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Выкарыстанне ў спецыяльнай адукацыі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій адкрывае для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры новыя перспектывы для стварэння спецыяльных умоў для фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення, спецыфіка пазнавальнай дзейнасці якіх паказвае на патрэбнасць у асаблівай методыцы работы з імі на ўроках і рэалізацыі карэкцыйнай накіраванасці адукацыйнага працэсу.

Прадукты камп’ютарных тэхналогій выкарыстоўваюцца ў спецыяльнай адукацыі для рашэння дзвюх задач: далучэнне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця да агульнага адукацыйнага працэсу і павышэнне даступнасці адукацыйнага асяроддзя. Адной з асноўных мэт развіцця дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення з’яўляюцца ўмовы для фарміравання іх эмацыянальнага, сацыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялу. Зрабіць гэта найбольш эфектыўна дазваляе выкарыстанне ў адукацыйным працэсе электронных адукацыйных дапаможнікаў.

У працэсе даследавання паступова былі вырашаны наступныя задачы:

1. Раскрыты тэарэтычна-метадалагічныя падыходы да фарміравання моўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы:

- Кампетэнтнасны падыход – фарміраванне ў вучняў моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, рытарычнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый.
- Сістэмна-функцыянальны падыход – засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыя моўнага матэрыялу для авалодання моўнай кампетэнцыяй.
- Сацыякультурны падыход – асэнсаванне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін, садзейнічае фарміраванню сацыякультурнай кампетэнцыі.
- Камунікатыўна-дзейнасны падыход – дзейнасць вучняў у розных маўленчых сітуацыях.
- Лінгвакультуралагічны падыход – усведамленне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, садзейнічае фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі.
- Рытарычны падыход – фарміраванне ў вучняў ведаў аб правілах маўленчых зносін, авалоданне дыялагічнымі і маналагічнымі сродкамі

маўленчага майстэрства, садзейнічае фарміраванню ў вучняў рытарычнай кампетэнцыі.

2. Вызначаны асаблівасці фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення:

- Фанетыка-фанематычныя парушэнні, якія вядуць да скажэння і несфарміраванасці фанематычнай сістэмы, што з'яўляецца асноўнай перашкодай да авалодання правільным, паўнацэнным пісьмом.
- Беднасць слоўніка, своеасаблівасць яго ўжывання абумоўлена адставаннем моўнага развіцця, індывідуальнымі псіхафізічнымі асаблівасцямі, асаблівасцямі ўзаемадзеяння і моўных зносін з навакольным асяроддзем, часта і фактарамі сямейнага выхавання.
- Недастатковая сфарміраванасць граматычных сістэм абумоўлена недаразвіццём фанетыка-фанематычнай і лексічнай моўных сістэм: не фарміруецца разуменне і выкарыстанне разнастайных граматычных структур, асабліва тых, якія перадаюць часавыя і прасторавыя адносіны, што вядзе да аграматызму ў вусным і пісьмовым маўленні, а таксама засваенне значэння слоў, звязаных з тактыльна-датыкальнымі ўяўленнямі (цёплы, халодны, гладкі).
- Недаразвіццё вуснага маўлення, у прыватнасці непаўнавартаснасць фанематычнага слыху, і недахопы вымаўлення, перашкаджаюць авалоданню фанетычным складам слова, што можа праяўляцца як у няздольнасці злучаць літары і склады ў словы, у пропусках літар і складоў, у перакручванні слоў, так і ў поўнай страце здольнасці пісаць.
- Змешванне і замены графічна падобных рукапісных літар або фанетычна падобных гукаў на пісьме; скажэнне літарна-складовай структуры слова (пропускі, перастаноўкі, дабаўленне літар і складоў); парушэнне злітнасці і асобнасці напісання слоў; аграматызм на пісьме (парушэнне словазмянення і дапасавання слоў у сказе). Працэс пісьма павольны, почырк неразборлівы.

3. Распрацаваны электронны адукацыйны дапаможнік “Самастойныя часціны мовы” і вызначаны яго дыдактычны патэнцыял у фарміраванні моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення на ўроках беларускай мовы:

- У дадзеным рэсурсе аб'яднана восем асобных электронных сродкаў навучання: “Назоўнік”, “Прыметнік”, “Лічэбнік”, “Займеннік”, “Дзеяслоў”, “Дзеепрыметнік”, “Дзеепрыслоўе”, “Прыслоўе”.
- Электронны адукацыйны дапаможнік распрацаваны з пазіцыі кампетэнтнаснага падыходу ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па вучэбным

прадмеце “Беларуская мова” для 6, 7 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, абумоўлены практычнай накіраванасцю і накіраваны на фарміраванне ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення не толькі моўнай кампетэнцыі, але і гатоўнасці да самастойнай пазнавальнай дзейнасці, уменне працаваць з інфармацыяй з розных крыніц, імкненне да самаразвіцця і самапазнання.

- Аналіз атрыманых вынікаў эксперыментальнай дзейнасці дазваляе адзначыць дыдактычны патэнцыял электроннага адукацыйнага дапаможніка “Самастойныя часціны мовы” і сцвярджаць, што ён з’яўляецца істотным інструментам данясення вучэбнага матэрыялу да вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення.
- Станоўчым вынікам выкарыстання электроннага адукацыйнага дапаможніка “Самастойныя часціны мовы” і сістэмнай работы з’яўляецца сярэдні бал па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” па выніках выпускнога экзамену па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі за 2021/2022 і 2022/2023 навучальныя гады. За 2021/2022 – 6,9 бала, за 2022/2023 – 6,8 бала.

4. Укаранёны электронны адукацыйны дапаможнік “Самастойныя часціны мовы” ў працэс выкладання вучэбных прадметаў “Беларуская мова і літаратура” і “Беларуская мова”:

- Дадзены вопыт работы ў снежні 2022 года атрымаў перамогу на VIII Рэспубліканскім конкурсе “Сучасныя тэхналогіі ў спецыяльнай адукацыі”.
- У інтэрнэт-выданні ng-press.by у раздзеле “Метадычка” размешчаны артыкул “Аўтарскі электронны адукацыйны дапаможнік “Самастойныя часціны мовы” для фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і з цяжкасцямі ў навучанні”, дадзены спасылкі непасрэдна на распрацоўку і метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні электроннага адукацыйнага дапаможніка.

Вырашэнне задач дазволіла тэарэтычна абгрунтаваць і метадычна забяспечыць працэс фарміравання моўнай кампетэнцыі ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення сродкамі інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій на ўроках беларускай мовы.

Улічваючы вышэйсказанае, можна зрабіць вывад, што выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій спрыяе павышэнню якасці навучання, фарміраванню моўнай кампетэнцыі па беларускай мове ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення.